Свая балячка мацней баліць. Будучы беларусам, найперш за усіе думаяцца аб сваіой бацькаушчыня—Беларусі. Што нясе іой будучына, які ліос спаткае яе? Шмат іой прыйшлося выцярпець у мінуушчыня, шмат цярпіць яна і цяпер. Што і як,—ня буду пералічаць. Усім гэта вядома, і трывожыць старыя балячкі ня хочацца. Кожны зразумея мяне і бяз гэтаго. Адно толькі пытання займая мяне, і як цьвікі, сядзіць у маіх думках. Гэта пытання аб будучыня і пры тым нядаліокай будучыня нашаго змучанаго краю: як адаб'ецца на ім выбух усясьветнае рэвалюцыі, таго усясьветнаго катаклізму, які няміпуча павінян кончыць цяперашнюю міжнародную блутаніну?

Нямецкі імпэрыялізм цяжка паранены, але даліока яшчэ ня забіты. Іон яшчэ пастаіць за сваю быццю. Іон зробіць для свае абароны усіо, што толькі зможа зрабіць, іон сабярэ адусюль свае параскіданыя па сьвеця сілы і пэўне заядлую барацьбу ужо ня дзеля захапляння чужога дабра, а у абарону свайго уласнаго істнення. Магчыма што пры гэтым скупления сілау яму прыйдецца выступіць з нашаго краю і пакінуць віпскіх «нязалежнікау» іх уласнай долі. «Натура пустаты ня цярпіць». Усьлед за адходзячым гэрманізмам у край вярнецца Радавая уласць. Пачнецца расплата за палітычныя даугі, пдвядзення рахункау паміж двума напрамкамі беларускай палітычнай думкі, паміж «заходняй» і „усходняй“ ар'ентацыямі.

Я ведаю, што у часы вялікіх пераваротау пачування маюць вялікую моц над уыпкамі, як асобных людзей, так цэльных грамадау, што клікаць іх прыслухацца да голасу спакойнаго розуму,—дарэмная трата часу, але я ня магу змаучаць. І я мушу зьвярнуць тых, хто захоча паслухаць і падумаць над маімі славамі,—вось на што.

Яшчэ ня пасьпелі немцы выступіць з Беларусі, яшчэ нават самая магчымасьць іх адходу астаецца пад знакам запытання, а тым часам у някаторых з беларускіх дзеячоу „усходняе“ ар'ентацыі пачынаюць разгульвацца ня зусім-то пахвальныя апэтыты. Мне ужо даводзілася чуць выразы накштал такіх: „Эх, з якою радасьцяй я-б перавешау гэтых „нязалежнікау“ сваіою уласнаю рукою!“ Ясна, што калі людзям так настроеным давядзецца пабедна уступіць у забраную цяпер часьціну Беларусі, дык яны, даушы волю сваім „вешательскім“ апэтытам, наробяць надта шмат благога для нашай бацькаушчыны а разам і ля равалюцыі. І вось, я хачу перасьцярагчы іх, сказаць ім, покуль ня позна, што трэба умерыць свае апэтыты і больш слухацца голасу розуму, чым сваіх пачуванняу.

Моцна мыліцца той, хто кажэ аб вешанні усіх „нязалежнікау“. „Нязалежнічаство“ іосьць пэуны кірунак беларускай палітычнай думкі, і патрабуя да сябе пільнай увагі. Я зусім адкідаю прынцып палітычпай помсты, кары чалавека толькі за тоя, што іон інакшай думая, бачыць дабро свае бацькаушчыны у іншых формах быцця, чым другія. І дзеля гэтаго, я ня магу пахваліць тых няумяркаваных вешацельскіх апэтытау, аб якіх шла гутарка трохі рапей.

Але разам з гэтым, я зусім ня думаю заступацца за розных прахвостау, насьпех афарбаваушыхся у беларускі коляр і прыкрыушыхся фігавым лістком беларускаго нязалежнічаства толькі дзеля таго, каб мець магчымасьць *як найлепш уладжваць інтарэсы свае і сваіх блізкіх*, прадаючы і глумячы інтарэсы многаміліоннаго народу. Вот аб такіх „нязалежпіках“ дауно ужо плача вароука горкімі сьлязьмі ад нуды растання.

Трэба адрожніваць палітыку ад угалоушчыны. І наскольк я стаю за нячапання шчырых, чэсных сыноу свае бацькаушчыны, хаця, быць можэ, і памыляючыхся, але ня пакладаючы рук і ня шкадуючы ні сябе нават свайго гонару у нявымоуна цяжкіх варунках працуючых над адраджэннам бацькаушчыны,—настолькі ж горача я стаю за *безлітасную* кару тых, хто прадаючы народную долю, купляя сваю уласная шчасьця. А такіх мазурыкау шмат прыліпла да ці абрабляя свае „делянкі“. Але прыдзя час суду, калі усіо патаемная станя яуным, і ім прыдзяцца расплачвацца за усе свае „гешэфты“. *І ніхто ня мая права гаварыць аб літасьці да такіх людзей.*

Бяда толькі у тым, што „плевелы“ і „пшаніца“ так пярамяшаны паміж сабою, што трэба найвялікпае асьцярожнасьці, каб разам з „плевеламі“ ня вырваць і „пшаніцы“. Ніва нашa духоуная надта рэдзянькая, ураджай на іой надта слабенькі, і мы мусім шанаваць яго, як сваіо уласная вока. У няясным выпадку лепш прасьціць, чым караць. Нават някаторыс, напрыклад, здавалася-б самыя пэуные факты прыдзецца пакідаць бяз увагі.

Іосьць пэуны лік шчырых беларусау, нязамяпімых працаушкоу на народнай ніва, у якіх пацыяпальная ідэя заслапяя сабою усіо. Гэта іх слабая струнка, і хто патрапіць зачапіць гэтую струнку той можа весьці іх за сабою хоць у пекла. Палітычныя афэрысты рожных колярау, зляцеушыся на Беларусь, ведаюць гэта і карыстаюць.

І вот, калі прыдзя час расплаты, дык трэба быць надта асьцярожнымі, каб ня парабіць няпапраунае бяды, разам з благім нішчучы і добрая. „Воздайте Кесарево Кесареви, а Божіе—Богови!“

Павал ЛЮБЕЦКІ.

Ці шкодна?

Многія ат саміх беларусау-сацыялістау, ня толькі што расейцау, ці другіх, трымаюцца весь час тае абмылковае думкі, якая нібы чорт, пужая іх атрадзеньня беларускаго нацыянальнаго пачуцьця. „Гэта ж шавінізма, гэта ж разлом агульнаго хронту, гэта ж новая пута ля скаваньня працоунаго народу і г. інш.“ кажуць яны і да іх ня сілкуйся ужо ты падыці ні с чым: яны гуторыць с табою ня будуць, а адхрысцяцца, адмахаюцца рукамі і празавуць цябе ня болей ня меней, як або шавіністам, або нацыяналістам—пры чым у гэтыя словы залажаць такі сэнс, які знача: я табе вораг. Тоя, што гэткія людзі толькі і магуць заявяць з нятрывалымі і абманваючымі іх словамі ды махапьням рукі—і есцяка вялікая бяда. Бяда гэта—скутак палітычнае цемнасці і цемнаго блытаньня у повярху пазнаньня жыццявых з'яу. Есцяка у жыцьці, само сабою, шмат блытаніны, у якой разбірацца трэ умець якуратна, старэнна, а ня сеч с пляча, абы хуччэй усе было. Дзякуючы толькі мастацтву сеч—і астаецца тоя, што рожныя разумепьня з'ясняюцца шыварат—навыварат і коляр чорны—робіцца белым—ды наадварот. У нацыянальнум пытаньні блытая перш усяго тоя, што яго саправуды такі можна нахіліць у ва усе бакі. Гэтым карыстаюць і варагі сацыялізмы ды равалюцыі, нават варагі мерпаго спакойнаго поступу у перад. І ня раз, што мы бачым і цяпераka сваімі вачмі нацыянальная пытаньня у някаторых народау сыграла дрэнную рэч. На ім так сама стараліся і стараюцца збудаваць будынiну таго ці іншаго прыгону, але наагул, на працяту гісторіі яно служыць і культуры, і поступу.

Служыць і равалюцыі. Калі здаралася, што праз яго выгравала буржуазея і багатыя станы, та у большасці гэта было часовым, праходзячым. Усягдыж, на усціж-нацыянальная пытаньня вяло нават за сабою равалюцыю. Мы часта натыкаямся на тыя здарэньня і цяперака, чытаючы, што Індзія, напрыклад, пачыная атраджацца, або Ірландзія паустае супроціу Англі. Усе гэта кіруюцца атраджэньням нацыяпальным. Кожны малы народ прылучаяцца да культуры праз яго, кожны вялікі народ праз яго вялікім стауся. Дагэтуль закон жыцьця кіравау так, што адзнаючы свая нацыянальнасць, народ больш пасьпявау у развіцію і станавіуся правадыром поступу, навукі, адкрыццяу і праз гэта багацьця.

Праз яго выходзілі знатнейшыя творы вялікіх масцярoу, пісарoу, музыкантау і песьнярoу. Наканец, нацыянальная пачуцьціо ідзе за памяэт, змацоуваючы светлы і развіты народ у барацьбе за свабоду, якую так сама ляхчэй дастае, у свой чарод, нацыянальна сьвядомы народ. Французскія равалюцыянэры былі шчырымі нацыяналістамі, гарыбальдзіпцы калісці так сама. У наш час ня трэба адказаць у гэтум фінляпскім, татарскім і латышскім працоунікам. Значa, адкуль ня паглядзі—нацыянальная пытаньня служыць на карысць працоунаму народу і патрэбнай ля яго свабоды. Гэтак стаіць справа з ім у другіх народау. Зусім ня шкодна яго вывa ля беларусау. Беларускі народ весь працоуны ні мая у сабе стану буржуазеі, ні грашаунікоу і баяцца захопу улады праз нацыянальная пытаньня ня варта. Заложаная і жывучая вось ужо колькі месяцау Беларуская Рада ніякім чынам ня ужыла беларускаму сяляніну пачуцьця шавінізмы. І яго ніхто ніколі ня ужыве яму. Тым часам у падняццю нацыянальнаго пачуцьця у ем чуяцца вялікая патрэба. І складам, і душою, і мовою, і этнаграфічнымі варункамі зусім асобны ад другіх, ен сцярау многа дарма часу і цяперака яму грозіць тоя, калі будзя гвалтоуна пярамагацца высунатая жыццём патрэба у яго нацыянальнум атрадзепьні. Прывіць дух чужыны праз навуку і управу—гэта значыць памагчы злым дзеям працягнуць далей час прыходу развіцьця, а з ім і свабоды ды поступу. У вольнуй праявя сваіх думак, у жыццявой творчасці патрэбна шырокая вольная пуціна, і беларускі народ яе чакая. Апроч гэтаго, праз выяву нацыянальнае тварыны у цяперашні час, трудны, губіцяльны і ліхі, ён мусіць паказаць сваім варагом, прасцершым за ім свае прагныя рукі, што ён ня блуда якаясь у сьвецця, ня прыпадкова закінутая кімсці рэч, што можа ею кожны карыстацца—а моцны, ядыны народ, хочучы жыць вольна і багата. Прэч жа пасягайцы! Вось усе доказы згодна гаворуць, што шкоднасці ад беларускаго нацыянальнаго пытаньня німа нізваньня, а яшчэ есцяка карысць ля Расейскае Равалюцыі. А як так, дык чамуж ня прымаць і працоунаму люду нацыянальнае палітыкі, у асобку датычна беларусау, прыхільна? І на вошта ня абдумана адмахвацца рукамі ад яго многім шчырым сацыялістам? Ціж ня лепі рынуцца у гушчу, бедную і пустую, беларускаго працоунаго народу, і абудзіючы да творчасці жыцьця і замаца ваньня свабоды нацыянальныя скарбы яго думак, быць хвармоушчыкам іх і праводнікам у жыццё? Вядома, што кожны, намагаушы добра, скажа, што інтарэсы Беларусі, свабоднай і багатай, многа болей памогуць справам працоунаго народу, ніж словы і дзеі тых, хто стараліся, забываючы праяву нацыянальнаго атраджэньня, сьпыняць пашырэньня равалюцыі і прыход інтарнацыянальнаго аб'еднаньня вольных народау.

Змітро Жылуновіч.

Рабоче-крестьянская Красная Армія.

„Красноармейская Звѣзда“.

Марш.

Не Море нам свѣтит с вышины,
Не кровожадный бог войны,
Не ради подлых барышей,
Сомкнув ряды, мы в бой идем,—
Мы бой с насиліем ведем.
Как в чистом полѣ алый мак,
Наш боевой сверкает знак
Свидѣтель связи вѣковой
Семьи всемірной трудовой,
Символ побѣднаго труда—
Красноармейская звѣзда.
Вся міроѣдская орда,
Всѣ угнетатели труда,
Всѣ пауки, всѣ кулаки,
Завидя красные полки,
Злой поднимают крик и вой:
Псы чуют час конечный свой.

ПРИПѢВ.

Всѣ, кто влачил судьбу раба,
Вся трудовая голытьба,
Всѣ бѣдняки, всѣ батраки,
Увидя красные полки,
Спѣшат привѣтом встрѣтить их,
Освободителей своих.

ПРИПѢВ.

Через деревни, города,
Под алым знаменем труда
Мы всѣ идем плечем к плечу,
Неся погибель палачу,
Всѣм, кто питался ряд вѣков
Кровавым потом бѣдняков.

ПРИПѢВ.

Мы—лишь отряд передовой
Всемірной рати трудовой.
Вся рать идет за нами вслѣд
Для сокрушительных побѣд.
Уж слышит в страхѣ стан врагов
Желѣзный гул ея шагов.

ПРИПѢВ.

Спицы въ колесницѣ.

Много уже писалось и говорилось и въ газетахъ, и на митингахъ, и на съѣздахъ о томъ ужасномъ положеніи, въ какомъ находятся бѣженцы, въ особенности бѣднѣйшіе слои ихъ. Ужасы переживаютъ они отъ холода и голода, отъ безработицы и безпріютности. Еще хуже ихъ положеніе, когда они рѣшаются двинуться въ путь, на которомъ ждутъ ихъ тысячи испытаній. Повторяю, что все это давно извѣстно всѣмъ, но отъ этого не легче. Принимаемыя мѣры не могутъ окончательно пресѣчь затрудненія въ отправкѣ бѣженцевъ, и случаи какихъ-то ненормальностей въ этомъ дѣлѣ, къ сожалѣнію, происходятъ и до сихъ поръ.

Такъ, на 16 сентября новаго стиля была назначена отправка изъ Петрограда по Варшавской дорогѣ эшелона съ бѣженцами—бѣлоруссами. Записанные въ эшелонъ собрались къ поѣзду заранѣе, чтобы имѣть время устроиться. Но прошло 16 число, прошли и слѣдующіе четыре дня, а отправленія все нѣтъ. Всѣ пять дней бѣженцы вынуждены были прозябать вокругъ станціонныхъ зданій Варшавскаго вокзала, ночуя на дворѣ и перенося дожди. Уйти отъ вокзала каждый опасался, боясь упустить поѣздъ, такъ какъ относительно времени отправленія никто не могъ сказать что-либо опредѣленное. Въ бараки почему-то не пускаютъ. Итакъ, безъ пищи, безъ теплой одежды, подъ дождемъ ночью и днемъ принуждены бѣженцы съ дѣтьми сидѣть цѣлую недѣлю, и хоть бы сказалъ кто-нибудь, когда же отправятъ.

Между тѣмъ, 20 сентября эшелонъ отправился. Прибыли ко времени отхода его какіе-то господа въ автомобиляхъ. Проходя въ вагоны, они еще хвастали: «Вотъ мы записались на Спасской 18 сентября, и уже ѣдемъ. А вы-то сидите. Видно у васъ учрежденіе такое, что ничего не стоитъ, не можетъ ничего сдѣлать!» Оказывается эти господа записались у предсѣдателя Литовскаго Совѣта, и сразу безъ дальнихъ хлопотъ уѣзжаютъ себѣ спокойно. Пошли, представились дипломатическому посреднику, объявили себя внѣ русскаго подданства и получили возможность легко и безпрепятственно проѣхать, при этомъ еще измываясь надъ несчастными людьми и дискредитируя въ ихъ глазахъ то учрежденіе, которое знаетъ одну дорогу, дорогу прямую—къ единенію и общности съ трудовой Россіей въ ея идеалахъ революціи и которому чужды и непонятны и закулисная игра дипломатіи какой-то и тошнотворный сепаратизмъ и навязчивая идея, присущая литовской шляхтѣ о королевствѣ и королѣ.

Непозволительно, чтобы эшелонъ съ латышскими крестьянами пріостанавливался и уходилъ 28 числа вмѣсто 21; невозможно, чтобы бѣлорусскіе селяне, становящіяся черезъ нѣкоторое время гражданами Россійской Республики, валялись по недѣлямъ на вокзалахъ, въ то время, какъ буржуазія плыветъ и эшелонами и въ одиночка, прячась за забраломъ иммунитета, даруемаго ей ею же самой созданными крулевствами, королэвствами, народными республиками и прочей чертовщиной. И пусть бы себѣ уѣзжали, не заражали здѣсь воздуха, но еще стараются мутить, зудить изголодавшагося человѣка, натравливая его на его же товарищей, чтобы этимъ подорвать престижъ народной власти.

Съ такимъ явленіемъ, какъ въ высшей степени вреднымъ, необходимо бороться самымъ рѣшительнымъ образомъ.

Не должно быть никакого преимущества реэмигрантамъ, будь они хоть подданные трехъ крулевствъ сразу. Пока находятся въ предѣлахъ Совѣтской Россіи, они имѣютъ ни на капельку не больше правъ и преимуществъ, чѣмъ каждый крестьянинъ и рабочій, а поэтому никакими привиллегіями и исключеніями въ отправленіи на родину пользоваться не должны.

М. Н.

Нямецка-расейскія угаворы об рубяжох.

У вячэрнюм нумары (487) ад 23 сепцябра „Норд-Деутше Альгемейне Цейтунг“ надрукована вось якое павядамленьне з Коуны ад 19 сепцябра:

Засядаушая у Вільні нямецка-расейская Камісія аб рубяжох скончыла 15 сепцябра свае работы. Аб аслабаненьні ад вайскоу вакругі па усход ад Бярэзіны, як аб гэтым спазналі „Балтыцка-Літоускія весткі“, спончылася Угаворамі, па якім мейсцо на усход ад Бярэзіны, на поудзянь ад Полацку і да места к поупачы ад Гомялю, у стасунку [illegible] там 3 § 1 Нямецка-расейскае гр[illegible] згоды ад 27 аугуста 1918 году [illegible] частковых сумах, якія маюць бы[illegible] рададзяны у відзя плацяжу на[illegible] грашмі, будзя аслабанено у пяці ча[illegible]. Аслабаненьне пачынаецца с поуночы з Лепяльскае вакругі і даруя свабоду у першых чатырох частках на поудзень па дарозя Ворша - Магіліоу, Рагачоу і мейсцо да рэчкі Друт*). Пятаю часткаю будзя вернута зямля на заход ад Друты да Бярэзіны. Вывад вайскоу пачнецца 20 сепцября 1918 году і павінны быць скончаны 28 феураля 1919 году. Трудпасці вывязці знаходзячаеся у аслабаняямум краю нямецкую маєтпасць платы прывялі к стасунку аб часу аслабаненьня, якое залежыць ад рожніцы і вялічыні паласы і ад калічаства дабра, якое мая быць вывязяно назад. Бярэзіна застаецца і пасля аслабаненьня так сама сусім у нямецкум абладаньні. На усходнюм ле беразя замыкаецца нейтральная зона. Вайскам**) будзя дастауляно карыстаньне гэтаю рэчкаю дзеля пераездау, сплаву і інш.

Н.

*) Прыток Дняпра каля Рагачова. Пер.
**) Нямецкім. Пер.

Таварышы

Селяня і работнікі беларусы! Чытайця і шырця між усімі едзіную шчыраравалюцыйную беларускую газэту „Дзянніца“. А так сама усе, як хто можа, нясаромяючыся, присылайця весткі аб [illegible] у вашых ме[illegible]кау і селян, аб [illegible] з'явішча[illegible]ах. З за вашаго [illegible] лежыць і посьпях [illegible]цію нашае газэты. Не[illegible] яна ня абміне, як наш[illegible] забранаго краю, гэтак і куткоу другіх краеу, жывуць браты [illegible]

Аб усім па троху.

З Беларусі.

Немцы пакідаюць Беларусь.

Публікуючы некатарые тэлеграмы з мест аб тым, як немцы гатуюцца да уцеку з належных да эвакуацыі мейсцоу і як яны тлумачаць сабе ачышчэння краю, Народны Камиссаріат Іназемных спрау ад сябе прыбауляя, што яшчэ 23-го сенцябра, адказваючы на патрэбавання Расейскаго Радавага Правіцяльства каб уладзіць гэтая пытання, паунамочны прадстаунік Радавае Республікі у Берліня— тав. Іоффе тэлеграфавау: „На конт скаргі па абірання краю пры ачышчэнні ад аккупацыі, тугака сталі глядзець з гэтакаго боку: нямецкі аккупаціонны урад мая права забіраць з сабою толькі тыя канфіскаваныя ім запасы, каторыя былі зканфіскованы да 6-го сенцябра, бач да ратыфікацыі дабавачнае згоды. Ніякія рэчы ня павінны вывозіцца, рэквізіцыі так сама забараняюцца“. Пасля гэтаго тав. Іоффе многа разоу заяуляу у Бэрліня аб нязаконных дзеях нямецкагоураду, гатуючаго к эвакуацыі аккупірованых мейсцау, і перапыніу нямецкая правіцяльства, што Расея будзя патрабаваць платы за тыя страты, якія будуць пры гэтум зробляны.

Эвакуація бѣженцев.

По вопросу дальнѣйшей эвакуаціи бѣженцев заключено новое соглашеніе с представителями германскаго консульства в Москвѣ. Согласно этому соглашенію, устанавливаются слѣдующія нормы «сдачи» бѣженцев за демаркаціонную линію: по Оршѣ 12 эшелонов в недѣлю, по Полоцку — через день по эшелону, по Себежу—также через ден по эшелону, и по Пскову — ежедневно по эшелону.

Из задержанных в настоящее время вагонов с бѣжанцами по Александровской, Виндавской, Риго-Орловской и Николаевской ж. д. будут сформированы эшелоны для немедленной сдачи за демаркаціонную линію. В эти эшелоны войдут также 2000 бѣженцев, разгруженных в бараках. Предполается, что к 29 сентября наряды по отправкѣ бѣженцев будут выполнены окончательно. Новые наряды, которые выдаются сейчас, [illegible] на прибытіе первых эшелонов в Оршу 30 сентября.

Чырвоная армія расце.

У Горы-Горках Магіліоушчыны мабілізацыя ідзе с посьпяхам. Няз'явіушых німа. Штодня адбываюцца вялікія зборышча мабілізаваных.

Грошай ня бяруць.

З Лепялю пішуць, што як выйшлі с туль немцы, дык у жыхароу асталося шмат нямецкіх акупацыйных грошай, якіх ніхто ня бярэ. Вось табе і грошы! У павеця хлеб шмат патаннеу. Гэта праз тоя робіцца, што шмат памешчыкау уцякая разам з немцамі і усе распродваюць.

Важная чугунка.

З Мецісłаулю павядамляюць, што нямецкая улада зацікавілася дабудоуляю чугункі ад Мінску на Камянь і выказала хаценьня як мага пастарацца, каб ня дазволіць папсаваць дарогу і раскрасці чугунковая дабро. Гэта чугунка з аднаго боку кіруя на Ліду, а з другога праз Магіліоу на Рослауль і павінна злучыць Велікарасею з Беларуссю. Яна [illegible] вялікую акапамічную значнасць [illegible]шчыны.

Кулакі, упіліліся.

У Надзейкоускуй воласці Магілеушчыны; ня глядзючы на тоя, што у канцы аугусту месяцу адбыліся пяравыбары у Савет і яго выканаучы камітэт, кулакі пралезлі і маюць у іх вагу. Стараюцца, як мага, каб іх выпхнуць.

Зусім іначай.

За тоя у большасці другіх мейстоу радавая уласць замацоуваяцца дужа скора і добра. [illegible] у Бярозаускуй [illegible] сустракаюць усе [illegible] жыхары добра сталі разумець [illegible] радавая уласць—гэта іх [illegible].

[illegible] і так і трэба.

[illegible]оускуй воласці Магілеушчыны [illegible] папгавы, прыбрана жыта [illegible] палоу. Сабрана жыта [illegible] 261[illegible] раскра[illegible]. Старацца іх вярнуць.

Селянскі [illegible]

[illegible] Вітаб[illegible] Вайсковы [illegible] Партыю-вааму К-ту разам з выбранаю ужо камісіяю ат арганізацыйна-агітацыйнаго пад'атдзелу вясці надгатовачную работу ля склікання 4 селянскаго з'езду.

Чытальні ля рабочых.

У блізшы час у Вітабску атдзел люцкоя асьветы мая адчыніць рабочыя чытальні. Цяперака шукаюць падхадзяшчых будынін.

Дарэмна, кровасмокі!

Надоячы у Кіявя на парадзя сяброу быушых Гасударскіх Думау і Савету у ліку 95 чал. пастаноуляна пратаставаць супроць чырвонаго тэррару (устраншэ), а так сама прасіць гэтмапа далучыць Беларусь да Украіны. Там жа, з'ехаушыя на з'езд беларускія купцы і паны, так сама настойваюць пярад гэтманам таго ж самаго. Гэтман абяцау памагчы.

Сярод беларусау.

У Пецярбурзі Беларускі атдзел Нацыянальнаго Камісарыяту адчыніу гімназыю і залажыу вышэйшая экапамічная обчаства.

З дапамогаю акадэміка Альдэнбурга выдавецкі атдзел пры Пецярбурскім атдзяленьні Беларускаго Нацыянальнаго Камісар'яту маркуя выдаваць чавуковы журнал „Беларуссія“. Ля супрацоуніцтва запрашаюцца вядомыя беларускія вучоныя, як: Брайцау, Пічэта, Карскі, Жуковіч і др.

На распараджэнью Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту аслабаджон заарыштаваны беларускі дзеяч А. Цвікевіч.

З-ЗАГРАНІЦЫ.

Смяртаваньня за пракламацы супроць вайны.

Праз Жанэву пішуць, што Ліонскі вайсковы суд прысудзіу да смяртаваньня шоффэра Ліэн, які паусюжыу сярод рабочых у Сэнатьяне пракламацыі супроць вайны, вывязяныя ім з гэрманскае граніцы.

Рух супроць вайны.

Дапішчык жанэускае газэты „Гамбургэр Нахрыхтэр“ павядамляя, што кангрэс, (з'езд) амярыканскіх сацыялістау, які адбыуся у Чыкаго аднагалосна прыпяу разалюцыю за замірэньня. У разалюцыі гаворыцца, што абвяшчэньня вайны злучанымі штатамі Амэрыкі было праступкам ня толькі супроць амярыканскаго народу, але і супроць усяго сьвету.

Баяцца бунтау.

Аустрыяцкі цар прыказау сыпыніць працу ваенна-палявога суду, які судзіу некулькі сотак польскіх лягыянэрау за змену гасударству. Зрабіць гэтак заставіла цара вялікая знядавольства шырокіх колау польскаго грамадзянства у Аустрыі, якія спагадалі бунтоуны лягіянэрам.

Халера у Бэрліня.

У Бэрлін пяракінулася халера. У адным доме захварэла 9 чалавек. З іх 8 памерла.

Дарога паветрам з Гэльсінфорсу да Петраграду.

Як павядамляя нямецкая газэта „Франкфуртар Цэйтунг“, кампаньня валаданьня аляктрычаствам у Стакгольмі (Швэцыя) мая намер паладзіць штодневы няраезд паветрам ля людзей, а так сама і ля пяравозкі пісям з Гэльсінфорсу у Петраград, Рыгу, Або, Стакгольм.

Аустрыя развальваьцца.

Спрэчкі паміж пацыянальнасцямі у Аустрыі дайшлі да няймаверпасці. Гострыя агалоскі чэхау і паудзенных славяпау ня пакідаюць ніякаго сумленьня у тым, што колы гэтых нацыяу парашылі злыгаць сваю долю с хаурусьнікамі і дамагчыся гасударскае незалежнасці на будучым усясьветным кангрэсу, які яны стараюцца як мага прыбліжыць. Палякі патрабуюць адбудовы нязалежнасці польскаго гасударства, да якога павінны адыці усе часткі Польшы, у тым ліку і аустрыяцкія. Спрэчкі да таго сталі гострымі, што нямецкія пацыяналісты нарашылі пакінуць райстах (нібы паша быушая дума) і залажыць собсцвянны пацыянальны Сэйм. Хоць гэта парашэньня яшчэ ня прынята ікрас. Хрысціянскі сацыяліст Матайа патрабуя, каб правіцяльства [illegible] пантралістычныя дамагань[illegible] усе сабраць у адно мейста, і зрабіла нацыянальная замірэньня на фундамэнт[illegible] самаабудаваньня кожным народам [illegible] жыцьця. Яго падтрымаў [illegible] Вальнер, [illegible] Адлар стараяцца правапаць пямецкіх дапутатау райстагу падтрымаць пацыяпальныя правы, як іх дамагаюцца другія пацы. Даляй Адляр пратаставау супроць Брэскаго замірэньня, прызываючы яго праступкам і кажучы, што ля дабра пямецкаго народу яго трэба скасаваць.

Англіцкія рабочыя бастуюць.

Забастоука англіскіх ткачоу усе пашыраяцца. Лік бастуючых вырас да 300.000 чал. з 2.000 фірмау (гандлёуныя хэуры, якія маюць хвабрыкі у сваіх руках). Калі рух захопіць і блізкія да паперапральняу промыслы, та лік бастуючых вырасця да 1.000.000. чал.

Бунты у Ротэрдамя.

Газэты павядамляюць аб сур'езных бунтах у Ротэрдамя, якія ушчаліся праз тоя, што ня дастае яды. Бунтуючыя разбілі булачныя і каляскі, на якіх пяравозілі хлеб. Кабеты зрабілі дамапстрацыю і прайшлі праз горад с крыкамі:

„Мы галодныя! Дайця нам хлеба“!

Немцы здаюцца.

Той няуспех, які выпау на долю немцау у апошнія часы, як то: атход пад надавам хаурусьнікау і сцера шмат войска палонпымі ды забранай у перад зямлі, а так сама астауленьня іх Баугарыю і, можна сказаць, Турцыяй, устрывожыла іх ня парокам. Да гэтаго прыбавілася яшчэ і нарастаныя равалюцыі. І вось яны загутарылі аб замірэньню. Дзеля гэтаго паслалі амэрыканскаму празыдэнту вось якую прапанову:

„Гэрманская правіцяльства хадайнічая пярад празыдэнтам Злучаных Штатау Амэрыкі узяць у свае рукі адбудову замірэньня, павядаміць аб гэтым усе ваюючыя гасударствы і запрасіць іх адправіць упоунамоцных дзеля таго, каб ушчаць згаворы. Гэрманская правіцяльства згодна прыняць за фундамэнт згавору аб замірэньні тую праграму, якую прапанавау празыдэнт злучаных штатау Амэрыкі, зварочваючыся да кангрэсу 8 января 1918 г. і у пазнейшых яго заявах, бач, у рэчы 27 сенцябра. Каб пакінуць далей праліваць кроу, нямецкая правіцяльства хадайнічая залажыць агульная замірэньня на сушы, у вадзе і у паветры“. Гэткую ж прапанову злажыла і Аустрыя.

Кангрэс француэскіх сацыялістау.

6 акцябра адбыуся у Парыжу кангрэс (з'езд—парада) француских сацыялістау, дзе мелася вялікая грызня паміж лівымі і правымі француекімі сацыялістамі.

Нязалежных арыштоуваюць.

Праз Цюрых (Швэйцарра) з Гэрманьні павядамляюць аб арышця надоячы 12 кіраунікоу Саксонскае секцыі партыі нязалежных сацыялістау у Дрэздэне, Хэмніцу і Цвікау. Паміж арыштованнымі знайходзіцца Гэкарт, якога мецілі паслаць дапутатам у райстах. Арышты гэты зробляны у скутку адбыушых у Саксоні бунтах рабочых.

У Польшы бальшавіства расце.

Газэта „Манітор Польскі“ змешчая абвестку польскаго правіцяльства, якім пасяленьня запрашаяцца дабрахоць іці у польскую армію. Але дзеля таго, што у Польшчы бальшавіства расце, адозва ня мая посьпяху.

З РАСЕІ.

Да паборы!

9 акцябра чырвоная армія забрала Самару.

Ня паможа!

Уцякаючы з Сызрані, чэха-славакі узарвалі вядомы Аляксандраускі мост праз рэчку Волгу.

Скарысталіся.

Надоячы у Сявастопалі заарыштавалі быушаго камісара па марскім справам Дыбенку.

За равалюцыю.

Вайсковы камісар Старадубскаго павету павядамляя, што другі Тарашчанскі украінскі полк пярайшоу дэмаркацыйную лінію каля Старадубу на Чарн[illegible]. Камандзеры разам [illegible] палком. [illegible] гэтаго палку [illegible] што яны болей ня хочуць сл[illegible] сель[illegible] і рабочых, як то есць[illegible] украінская буржуазная правіцяльства [illegible] у поуная распараджэньня радавае уласці.

Помста Чэха-Славакау.

У Сызрані чэха-славакі разстралялі камісерау: Бэрлінскаго, Аменскаго, Булыгіна, Гарэцкаго, Варлашава, Скварцова і каля соткі рабочых. Уцякаючы з Сызрані яны на параходзя разстралялі 25 чал. і з сабою павязлі 700 чал. Баяцца, каб іх ня утапілі у рэцца.

Кража люцкіх грошай.

З Вароняжа схавауся начальнік дарогі Вароняж - Царковіч, Іодка, украушы 150.000 руб. люцкіх грошай.

У Радакцыю газэты „Дзянніца“.

Шаноуная радакцыя!

Чытаючы у газэця „Дзянніца“ абвесткі аб сабе у закавыках („консул“) і ня ведаючы, скуль „Дзянніца“ бярэ іх, бо да мяне асабіста ніхто ня звяртауся да інфармацыі, я уважаю за патрэбная павядаміць, што усюдах вядзецца такі парадак, што чалавек лічыцца займаючая вядомая мейста з моманту, як ён пачыная спауняць свае абавязкі, а я консульства ня адчыняу і да спауненьня абавязкау консула ня прыступау, а дзеля таго я уважаю, што „Дзянніца“ памяшчая *няправерныя чуткі*, што мяне вельмі дзівіць. Што датыкаяцца маіх паездак, дык я як свабодны грамадзянін хіба магу ехдзіць свабодна. Калі у намеках „Дзянніцы“ нешта іншая хаваяцца, дык магу давясці да ведама рэдакцыю, што я равалюцанэрам ужо ад 90 гадоу XIX сталецьця і смела, ня уважаючы ні на што змагауся з царскім самауладствам тагды як іншыя баяліся царскіх рэпрэсый і сядзелі ціха. Гэткім я застауся і цяперака і больш за каго б душою баюся за лес свабоды, бо на штандарах равалюцыі есцяка мусіць і капля маей крыві. Ня ведаю, ці шмат знайдзяцца такіх, каторым лес працоунай беднаты Беларусі быу бы даражэйшы, як мне.

С пашанай **Ал. Бурбіс.**

Р. S. Уважаю, што Радакцыя магла памяшчаць абвесткі аба мне па нядагляду хіба.

Радакцыя: Даючы мейста заяве пана Ал. Бурбіса, радакцыя дзівіцца цудоунаму разуменьню ім памешчаных у „Дзянніцы“ аб ем абвестках. Неяк прыкра даваць тлумачэньня самавітаму чалавеку аб тэхніца зместу рожных вядомосцяу у газэтах, але, каб і у прауду яму ня думалася, „што у намеках „Дзянніцы“ нічога іншаго ня хавалася“ і праз гэта ня турбавауся п. А. Бурбіс атаставаць сябе дарэмна і пяупапад, скажам: радакцыя, дзякуй Богу, мая магчымасць і бяз інфармацыі даставаць навіны, раз. А, другі раз, ліхамыслыя закавыкі, якія так уразяць яго — вымагаюцца яго заблутанным палажэньням. Як беларускі, гэтак і расейскі друк павядаміу свет, што „вядомы беларускі дзеяч, закладчык Беларускай Сацыялістычнай Грамады А. Л. Бурбіс назначан Сакратарыятам Беларускай Народнай Распублікі консулам у Маскве“, з аднаго боку, а з другога, павядамленьня у друку „назначанаго консула“, што то ня прауда, што ен ня прыняу назначэньня— ня было (калі мы ня прапусцілі толькі), а у канцы ж і, як сазнаецца сам „консул“, ен консульства ня адчыняу—дык і выходзіць: дзіцячая правіцяльства, гуляючы у дзіцячую гульню, па дзіцячы назначыла (нібы) консула, якога, даруйця, бяз закавык і пісаць сорамна.

Радакцыя.

Радактуя і ведае Друкарскі Атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

[illegible] Сов. Раб. Деп. [illegible] пер., д. 12